З першых вуснаў

# «КАЛІ ЛЕНІНГРАДЦЫ І БЕЛАРУСЫ ПАЧЫНАЮЦЬ НЕЙКУЮ СПРАВУ — ЗАЎСЁДЫ ІМКНУЦЦА ДАВЕСЦІ ЯЕ ДА ЗАВЯРШЭННЯ З НАЙЛЕПШЫМ ВЫНІКАМ»

## Падрабязнасці сустрэчы Прэзідэнта і губернатара Ленінградскай вобласці

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Ленінградскай вобласці Аляксандрам Драздзенкам. Гэтымі днямі праходзіць візіт дэлегацыі Ленінградскай вобласці ў Беларусь. Аляксандр Драздзенка ў статусе губернатара наведвае нашу краіну ўжо шосты раз. А ў 2023 годзе гэта ўжо яго другі візіт у Беларусь, летам ён наведваў Брэсцкую вобласць.**

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што шчыра рады вітаць гасцей на беларускай зямлі. «Ёсць аб чым пагаварыць. Калі ўжо вельмі шчыра, то мы б вельмі хацелі зрабіць у Расіі перш за ўсё стаўку на ваш рэгіён у супрацоўніцтве», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён адзначыў, што з Санкт-Пецярбургам і Ленінградскай вобласцю ў Беларусі ўзорна-паказальныя адносіны. Але, па яго словах, гэтыя адносіны павінны мець большую эфектыўнасць.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў беларусаў і ленінградцаў разуменне аб далейшых шляхах развіцця аднолькавае і планаванне вынікаў, погляды ідэнтычныя. «Калі ленінградцы і беларусы пачынаюць нейкую справу — заўсёды імкнуцца давесці яе да лагічнага завяршэння і з найлепшым вынікам», — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што падчас папярэдняй сустрэчы ў ліпені 2022 года была вызначана мэта — выйсці на запаветны мільярд у гандлі. Для гэтага ў гадавым вылічэнні аб'ёмы паставак трэба нарасціць на 20 працэнтаў. «Мяркую, выканальная задача ў цяперашняй сітуацыі, і мільярдам мы сапраўды не будзем абмяжоўвацца. Гэта толькі ўмоўны арыенцір для нас», — сказаў ён.

### «Мы цяпер будзем больш глядзець на сябе»

Прэзідэнт згадаў адно з выступленняў Аляксандра Драздзенкі, дзе той адзначаў, што традыцыйныя перавагі Ленінградскага рэгіёна, які мяжуе з Еўрасаюзам, сталі з 2022 года фактарамі рызыкі. «Дзякуй богу, нам гэта вельмі выгадна, і Расіі таксама. Мы цяпер будзем больш глядзець на сябе і думаць, як нам развівацца далей», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў панядзелак правёў тэлефонную размову са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Па яго словах, кіраўнікі дзяржаў абмяркавалі два праекты, якія плануюць падрабязна разгледзець у кастрычніку ў Кыргызстане ў рамках пасяджэння кіраўнікоў дзяржаў — краін СНД. У прыватнасці, па словах Аляксандра Лукашэнкі, падчас тэлефоннай размовы прэзідэнты абмеркавалі сумеснае будаўніцтва самалётаў невялікай умяшчальнасці, якія вельмі запатрабаваны і патрэбны ў Расійскай Федэрацыі. У Беларусі ёсць адпаведныя кампетэнцыі, і Уладзімір Пуцін прапанаваў гэты самалёт пабудаваць сумесна, расказаў беларускі лідар. Таксама гаворка ішла аб больш актыўным асваенні вытворчасці кампанентаў для ІЛ-96 і абслугоўванні гэтых самалётаў у Беларусі. «Мы гэта можам зрабіць, гэта вельмі вялікі кавалак работы», — дадаў беларускі лідар.

Другое пытанне, абмеркаванае прэзідэнтамі, — будаўніцтва другой чыгуначнай веткі з Беларусі да Ленінграда, каб была магчымасць перакідваць большы аб'ём беларускіх грузаў у балтыйскія парты і адтуль працаваць на ўвесь свет. «Вы разумееце, для нас гэта вельмі важна, мы займаемся будаўніцтвам там партовай інфраструктуры. Але вузкае месца ў нас — чыгунка», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Перспектывы рэалізацыі праектаў, паводле слоў Прэзідэнта, ужо абмяркоўваліся з расійскімі ведамствамі, па іх падрыхтаваны пакет неабходных дакументаў, матэрыялаў, якія будуць перададзены кіраўніку расійскай дзяржавы.

«Вось толькі два прыклады з кароткай размовы. Гэта нашы сумесныя мерапрыемствы, якія мы можам рэалізаваць. А калі б Аляксандр Юр'евіч па-ранейшаму арыентаваўся на суседзяў, на Еўрасаюз, то мы б гэтымі пытаннямі яшчэ не займаліся. Так што не бывае нейкіх аднабаковых выгад і ўдач», — сказаў беларускі лідар. Па яго меркаванні, праблемы, якія сёння ёсць, Беларусь і Ленінградская вобласць адолеюць.

«Лічу, ленінградцы пры падтрымцы беларусаў паспяхова спраўляюцца з праблемай. Тэмпы развіцця эканомікі — пераканаўчае таму пацвярджэнне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

### Выкарыстоўваць моцныя бакі адзін аднаго

Прэзідэнт заўважыў, што з дапамогай калег з Ленінградскай вобласці беларускі бок пераарыентаваў лагістыку, і беларускія вытворцы зноў маюць магчымасці гандляваць у Азіі, Лацінскай Амерыцы, Блізкім Усходзе і Афрыцы. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што гэты напрамак будзе ўмацоўвацца.

«Для многіх заходніх палітыкаў стала сапраўдным адкрыццём, што свет значна шырэйшы за іх вузкія ўяўленні. Як звычайна, вырашылі па-руску: давай у бойку ўцягнемся, а там будзе відаць. Аказалася, калі не рускія, то і не атрымаецца», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзякуючы прамкааперацыі Беларусі і Ленінградскай вобласці ўдалося максімальна эфектыўна выкарыстоўваць моцныя бакі адзін аднаго для дасягнення тэхналагічнага суверэнітэту. Па яго словах, гэта дазволіць не толькі даць адказ на любыя спробы ціску Захаду, але і стварыць новае, здаровае канкурэнтнае асяроддзе ўнутры Саюзнай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка прывёў просты прыклад: «Нягледзячы на магутнае развіццё АПК у Беларусі і Ленінградскай вобласці (мы заўсёды паглядалі адзін на аднаго, бачачы ў гэтым канкурэнта нейкага), мы паспяхова знаходзім напрамкі, дзе можам адзін аднаго падтрымаць і за кошт гэтага дабаўляць у адносінах у сферы сельскай гаспадаркі».

«Нашы моцныя бакі — вытворчасць сельскагаспадарчых машын і агрэгатаў, зернесушыльных комплексаў, абсталявання для камбікормавых заводаў, выпуску харчовай прадукцыі, насенняводства і многае іншае. Я ўжо не кажу пра жывёлагадоўлю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі бок актыўна дзеліцца з аграрыямі Ленінградскай вобласці сваімі напрацоўкамі. Сярод іх, напрыклад, ветэрынарыя, дзе зроблены першыя крокі па развіцці супрацоўніцтва.

Па словах Прэзідэнта, беларускаму боку цікавыя напрацоўкі спецыялістаў Ленінградскай вобласці ў племянной жывёлагадоўлі, вытворчасці каштоўных парод рыбы, тэхналогіі работы цяплічных комплексаў. «У сваю чаргу аграрыям Ленінградскай вобласці можа быць карысны наш вопыт вырошчвання азімых культур — ячменю і рапсу, — заўважыў ён. — Прапаную таксама больш дэталёва адпрацаваць пытанні павелічэння паставак беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі, у тым ліку з прыцягненнем рэгіянальных субсідый, а таксама абсталявання для перапрацоўчай прамысловасці». Аляксандр Лукашэнка згадаў вопыт такога супрацоўніцтва з Кубанню: «Яны зрабілі стаўку на нашу тэхніку, мы адгукаемся. Мы ідзём туды з тэхналогіямі, з людзьмі... Пачыналі са зборачных вытворчасцяў, цяпер сумесныя прадпрыемствы арганізавалі, лакалізацыю ўзмацнілі. Тым больш мы можам гэта зрабіць у вас», — заўважыў ён.

Па словах Прэзідэнта, вельмі важна, што Беларусь працягвае супрацоўніцтва з Ленінградскай вобласцю ў сферы развіцця транспартнай інфраструктуры. Беларускія прадпрыемствы актыўна ўдзельнічаюць у будаўніцтве ў Выбаргскім раёне збожжавага тэрмінала, які будзе мець магутнасці па захоўванні 210 тысяч тон збожжа (праектная прапускная здольнасць тэрмінала — 4 мільёны тон за год). «Упэўнены, гэты праект таксама прынясе важкую карысць і нашым сябрам у Лацінскай Амерыцы: Бразіліі, Венесуэле і іншым краінам, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўдзячны вам за прыцягненне айчынных прадпрыемстваў да рэалізацыі найважнейшых для Ленінградскай вобласці праграм. Адна з іх — будаўніцтва станцый па водаачыстцы і водападрыхтоўцы. Сёння ў Ленінградскай вобласці працуе 37 аб'ектаў, пабудаваных «пад ключ» з выкарыстаннем беларускіх тэхналогій. Вы ўжо пазнаёміліся з іх магчымасцямі, работай. Мне дакладваюць, што вамі падрыхтавана праграма будаўніцтва больш за 100 такіх аб'ектаў. Да яе фінансавання гатовы далучыцца Банк развіцця Рэспублікі Беларусь», — дадаў ён. Таксама пачата рэалізацыя праекта будаўніцтва школы больш чым на 800 месцаў у Ламаносаўскім раёне. Урадам вырашаецца пытанне аб выдзяленні спецыяльнага экспартнага крэдыту. «Гэта знаёмыя і дэталёва адпрацаваныя нашымі спецыялістамі задачы», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Новы кірунак — удзел беларускіх праектных і будаўніча-мантажных арганізацый у комплекснай мадэрнізацыі аб'ектаў паліўна-энергетычнага комплексу (кацельняў), стварэнні і рэканструкцыі крыніц цеплазабеспячэння муніцыпальных раёнаў». Таксама новыя напрамкі супрацоўніцтва: пастаўка беларускіх будаўнічых матэрыялаў, дарожна-будаўнічай тэхнікі, цэменту, сценавых матэрыялаў, зборных канструкцый, бітуму, абмен вопытам у прымяненні сучасных тэхналогій дарожнага будаўніцтва.

«Пры гэтым я хачу вам прапанаваць не ствараць нейкіх паралельных вытворчасцяў, калі мы маем магчымасць экспартаваць. Мы з вамі заўсёды дамовімся па пастаўках, заўсёды, пры гэтым на доўгую перспектыву наперад. Вам сёння трэба грошы траціць на самае-самае неабходнае, і нам таксама. Навошта паралельныя вытворчасці ствараць? І пералічаные мной датычыцца гэтага пытання. Яшчэ раз падкрэсліваю: для таго, каб мець гарантыі, мы можам дамовіцца на вельмі працяглую перспектыву, на дзесяцігоддзі наперад, каб сумесна працаваць. Адлегласці тут мінімальныя, мы побач, і такі ўзаемны абмен прадукцыяй вельмі важны. Гэта толькі частка магчымых кірункаў нарошчвання нашага эканамічнага супрацоўніцтва. Можаце на нас разлічваць, калі вам патрэбная нейкая дапамога і мы можам яе аказаць, мы абавязкова гэта зробім», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што з улікам пажаданняў для дэлегацыі Ленінградскай вобласці падрыхтавана насычаная праграма. «Мы пакажам усе аб'екты, якія вас цікавяць. Сакрэтаў і таямніц ніколі не было ад вас і быць не можа. Нам трэба вельмі ўважліва паглядзець, дзе мы можам дапаўняць адзін аднаго, сур'ёзна працаваць на той вынік, на дасягненне той мэты, якую мы акрэслілі», — сказаў ён.

У праграме візіту дэлегацыі Ленінградскай вобласці, акрамя перагавораў з Прэзідэнтам, уключаны таксама рабочыя сустрэчы з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам, віцэ-прэм'ерам Мікалаем Снапковым, старшынёй Мінскага аблвыканкама Аляксандрам Турчыным. Таксама ў графік гасцей уключана наведванне ААТ «БелОМА», наведванне Беларуска-Кітайскага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», шэрагу прамысловых прадпрыемстваў, уключаючы зборачнае — вытворчасць аўтамабіляў «Джылі».

### У тэму

У размове з журналістамі галоўным вынікам сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам губернатар Ленінградскай вобласці назваў тое, што выканана пастаўленая задача — выйсці на аб'ём таваразвароту больш за мільярд долараў. «Мільярд у гэтым годзе будзе, і гэта галоўнае», — сказаў ён.

Па словах Аляксандра Драздзенкі, раней наменклатура грузаў складалася з прадукцыі сельскай гаспадаркі, нафтаперапрацоўкі, мінеральных угнаенняў, сёння гэта і тэхналогіі, і тэхніка, жыллёва-камунальная гаспадарка, энергетыка, навука, селекцыя, насенняводства і многае іншае. «Толькі ў гэту паездку мы хочам падпісаць некалькі новых кантрактаў на пастаўку больш чым 100 сучасных газавых кацельных. Актыўна ідзе газіфікацыя Ленінградскай вобласці, асабліва невялікіх пасёлкаў і вёсак, нам патрэбны сучасныя кампактныя кацельныя. Сёння іх у Беларусі вырабляюць. Навошта выдумляць веласіпед? Мы будзем купляць тое, што ёсць, тым больш вельмі добрыя суадносіны цаны і якасці», — сказаў губернатар. Па яго словах, у Ленінградскай вобласці субсідзіруюць пакупку беларускай тэхнікі, таксама як і расійскую тэхніку. І сёння аграрыі, леснікі, дарожнікі Ленінградскай вобласці выбіраюць беларускую тэхніку, бо вельмі добрыя адносіны цаны і якасці.

«І, што вельмі важна, мы шмат гаварылі аб гуманітарных сувязях і моладзі. Прэзідэнт сказаў, што за моладдзю — будучыня. І ад таго, якой будзе моладзь у Беларусі, у Расіі, залежаць і будучыя адносіны нашых краін. Мы павінны сёння быць як ніколі разам як брацкія народы», — сказаў Аляксандр Драздзенка.

### І ленінградцы, і беларусы разам духоўна

У сваю чаргу Аляксандр Драздзенка прызнаўся, што заўсёды з вялікім задавальненнем наведвае брацкую рэспубліку. І сустрэчы з беларускімі калегамі становяцца добрай традыцыяй, а самае галоўнае — прыносяць эфект. Ён расказаў, што члены дэлегацыі наведалі мемарыяльны комплекс «Хатынь». Аляксандр Драздзенка выказаў словы ўдзячнасці за тое, што там зроблена апошнім часам. «Наша дэлегацыя выйшла эмацыянальна, душэўна ўзрушаная», — прызнаўся ён.

«Мы не можам ад вас адставаць», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Для нас гэта ўсё блізкае. І сапраўды, і ленінградцы, і беларусы разам духоўна, ментальна, і гэта ўсё праяўляецца», — заўважыў Аляксандр Драздзенка.

Губернатар Ленінградскай вобласці прывёў цытату Прэзідэнта Беларусі з выступлення на Дзень народнага адзінства: «Сёння над намі, як і напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, кружаць сцярвятнікі, кружаць вакол беларускіх, расійскіх, украінскіх земляў. І мы проста абавязаны аб'ядноўвацца і дзейнічаць адзіным фронтам. Іншага нам не трэба ды і не дадзена».

«Я заўсёды лічыў і лічу, што вы для нас ключавы партнёр, вы разумееце, чаму. Вы гэта сказалі», — адзначыў Аляксандр Драздзенка. Ён падкрэсліў, што ў чэрвені прайшло 11-е пасяджэнне рабочай групы Ленінградская вобласць — Рэспубліка Беларусь. І па наладжванні супрацоўніцтва вядзецца сістэмная работа. У пацвярджэнне сваіх слоў губернатар Ленінградскай вобласці прывёў лічбу: у 2022 годзе тавараабарот вырас на 18 працэнтаў і склаў 835 мільёнаў долараў. А за палову 2023 года аб'ём павялічыўся амаль на 25 працэнтаў і склаў 532 мільёны долараў. «Мы на мільярд выходзім, і ўжо ў нас сумненняў няма, таму што працэнт працягвае расці. Менавіта дзякуючы такому шчыльнаму супрацоўніцтву. У нас наменклатура толькі за апошні год павялічылася на 70 новых пазіцый. Такога раней не было, каб так хутка расла наменклатура нашых узаемных інтарэсаў», — сказаў Аляксандр Драздзенка. Ён расказаў, што ў Ленінградскай вобласці адкрываюцца кірмашы, крамы з беларускай прадукцыяй. Рэгіён набывае шмат беларускай тэхнікі, толькі ў пачатку года закуплена 110 адзінак на суму больш як 300 мільёнаў рублёў, амаль трэць было субсідзіравана.

**Валерыя СЦЯЦКО.**